Паважаныя сябры!

Наш часопіс ужо неаднойчы звяртаўся да разгляду розных аспектаў такой з'явы, як грамадзянская адукацыя[1]. Падставай прысвяціць ёй чарговы нумар стаў праект «Грамадзянін.ВУ», арганізатарам якога выступіла Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы. У межах праекта адбыўся шэраг канферэнцый і круглых сталоў, пад час якіх эксперты, прадстаўнікі адукацыйных арганізацый і іншых структур абмяркоўвалі сучасны стан развіцця грамадзянскай адукацыі ў нашай краіне, вызначалі тэндэнцыі і прапаноўвалі крокі па развіцці. У нумары змешчаны аналітычныя артыкулы пра розныя аспекты грамадзянскай адукацыі, змест якіх быў прэзентаваны і абмеркаваны на канферэнцыі «Беларуская грамадзянская адукацыя і актуальныя грамадзянскія кампетэнцыі», апісаны ключавыя дзеянні і вынікі праекта, а таксама прыведзены прыклады канкрэтных навучальных праграм і праектаў.

Нягледзячы на тое, што розныя аспекты грамадзянскай адукацыі ў нашай краіне актыўна абмяркоўваюцца ўжо з сярэдзіны 90-ых гадоў мінулага стагоддзя, па-ранейшаму цяжка гаварыць пра гэтую з'яву як сістэму, як нейкую цэласнасць. І такая сітуацыя звязана, па-першае, з рамкавымі ўмовамі, што існуюць у нашай краіне, а па-другое, са створанай дзяржавай пэўнай сістэмай «грамадзянскай адукацыі», скіраванай на фармаванне індывіда, які не праяўляе ініцыятыву і залежны ад яе (дзяржавы). Разам з тым існуе і развіваецца дзейнасць правайдараў нефармальнай адукацыі. Усіх іх, пры пэўнай змястоўнай разнастайнасці, аб'ядноўвае арыентацыя на дэмакратычны вобраз будучыні і разуменне грамадзяніна як актыўнага прадстаўніка грамадства. Гэтую сітуацыю ў артыкуле «Канцэптуальныя альтэрнатывы грамадзянскай адукацыі ў Беларусі» падрабязна апісвае Вячаслаў Бабровіч.

Безумоўна, няма патрэбы паўтарацца з высновамі, што робяцца аўтарамі артыкулаў. Але хочацца звярнуць увагу на некаторыя значныя, на мой погляд, тэндэнцыі ў дачыненні да грамадзянскай адукацыі:

- **Невялікая колькасць адукацыйных праектаў і праграм, дзе зместам выступаюць пэўныя аспекты грамадзянскасці** (гісторыя, правы чалавека, гендарная роўнасць, устойлівае развіццё і г.д.). Гэта тэндэнцыя тычыцца нават сферы нефармальнай адукацыі. Тут пераважае альбо тэматыка, звязаная з прафесійнымі кампетэнтнасцямі, альбо дзеянні, скіраваныя на асабаснае развіццё. Пры гэтым ёсць шмат прыкладаў цікавых, карысных і эфектыўных адукацыйных праектаў і праграм, што рэалізуюцца недзяржаўнымі арганізацыямі. У гэтым нумары апісваюцца некалькі з іх. Так, Аліна Курленка распавядае пра досвед арганізацыі Летніка па правах чалавека, які ўжо стаў традыцыйным. З артыкула Юлі Станкевіч чытач можа даведацца пра такую форму працы, як «Адкрыты моладзевы цэнтр». Можна яшчэ прыгадаць таксама адукацыйныя практыкі, што актыўна развіваюцца ў апошнія гады, такія як Лятучы ўніверсітэт (http://fly-uni.org), Еўрапейскі настаўніцкі клюб (http://www.nastaunik-club.info), Гістарычная майстэрня (http://gwminsk.com) і г.д.
- **Дзейнасць структур нефармальнай адукацыі ў галіне грамадзянскай адукацыі адрозніваецца надта вялікімі выдаткамі для дасягнення жаданага выніку.** Гэта рэгулярна фіксуюць прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. На жаль, у грамадстве не існуе запыту на грамадзянскія кампетэнтнасці, на грамадзянскасць. І розныя веды і ўменні, што атрымліваюцца ў рамках праграм у сферы грамадзянскай адукацыі, не толькі не даюць яго ўладальнікам якіх-небудзь адчувальных перавагаў, а часам наадварот — перашкаджаюць жыццю.
- **«Мазаічнасць» зместу грамадзянскай адукацыі.** Праграмы ў сферы грамадзянскай адукацыі, што рэалізуюцца арганізацыямі і правайдарамі, маюць розныя канцэптуальныя асновы (адны імкнуцца да нацыянальнай ідэалогіі часоў Адраджэння, іншыя да ліберальнай — з дэмакратычнымі каштоўнасцямі і працэдурамі). Пры гэтым паўстае пытанне, і даволі не рытарычнае, наколькі такі плюралізм спрыяе і дамапагае, а не перашкаджае развіццю і беларускай дзяржавы, і нашага грамадства ў накірунку развіцця сапраўднай дэмакратыі і грамадзянскай супольнасці.

Мэтаў і задач, якія стаяць перад грамадзянскай адукацыяй, не магчыма дасягнуць толькі сродкамі навучальнай дзейнасці правайдараў нефармальнай адукацыі. Вялікае значэнне маюць прынцыпы і механізмы, на якіх будуюцца адносіны ў грамадстве і дзейнасць іншых структур і супольнасцяў, такіх як сям'я, СМІ, тэлебачанне, радыё, літаратура, музыка, мастацтва і інш.

Таму, на мой погляд, без сінхранізацыі дзеянняў паміж рознымі інстытутамі і структурамі грамадзянскай адукацыі, што падзяляюць дэмакратычныя і нацыянальныя каштоўнасці, не магчыма якаснае развіццё ў дадзенай сферы. Безумоўна, гэты працэс вельмі няпросты, але ён сапраўды дапамог бы дасягнуць сінэргіі і зрабіць пэўныя працэсы незваротнымі. І адной з актуальных супольных задач магло б стаць фармаванне попыту на грамадзянскія кампетэнтнасці і пашырэнне «зоны бліжэйшага развіцця» на «грамадзянскія» тэмы ў нашым грамадстве.

Што тычыцца менавіта дзейнасці саміх правайдараў нефармальнай адукацыі, тут важным з'уляецца шэраг аспектаў:

- Адукацыйны кампанент павінен стаць складовай часткай грамадзянскіх, культурніцкіх і іншых кампаній.
- Дзейнасць у сферы грамадзянскай адукацыі па-ранейшаму трэба скіроўваць на развіццё грамадзянскіх кампетэнтнасцяў (крытычнае мысленне, дэмакратычныя працэдуры і г.д.).
- Праграмы, што развіваюць розныя прафесійныя веды і ўменні, неабходна арганізоўваць такім чынам, каб яны таксама будаваліся на прынцыпах і падыходах грамадзянскай адукацыі.
- Дзейнасць правайдараў НФА не павінна абмяжоўвацца праектнай формай працы, а станавіцца больш інстытуцыянальнай.

Задачы, што стаяць перад грамадзянскай адукацыяй, — складаныя і неадназначныя ў спосабах іх вырашэння. Таму вельмі важна, каб зацікаўленыя суб'екты і структуры аналізавалі сітуацыю, рэфлексавалі свой досвед і абмяркоўвалі між сабой розныя актуальныя моманты.

У межах IV Фестывалю нефармальнай адукацыі будзе арганізавана праца секцыі «Магчымасці нефармальнай адукацыі ў развіцці грамадзянскіх кампетэнтнасцяў». Ад імя арганізацыйнага камітэта запрашаем узяць у ёй удзел усіх, каго цікавіць названая тэма.

Са свайго боку, рэдакцыя часопіса ў чарговы раз прапаноўвае свае старонкі ў якасці дыскусійнай пляцоўкі і запрашае далучыцца да дыскусіі тых, хто неабыякавы да праблем станаўлення грамадзянскай адукацыі.

Дзмітрый Карпіевіч

[1] Так, цалкам тэме грамадзянскай адукацыі быў прысвечаны асобны нумар часопіса (Адукатар. №2 (12), 2007).